у дапамогу педагогу



# Псіхалогія

**Выпуск 4**

1996

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аiВ
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з IV квартала 1995 года
Рэгістрацыйны № 432

**Заснавальнік і выдавец –**
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"
*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

***Выпуск 4'96***

# Псіхалогія



**Рэдакцыйная калегія**
*Галоўны рэдактар*
Я.Л.Каламінскі
*Нам. галоўнага рэдактара*
А.М.Сізанаў
*Адказны сакратар*
Н.Ю.Зайцава

В. Ц. Кандрашэнка
Л. А. Панько
Л. А. Пергаменшчык
Г. Г. Рамановіч
Л. М. Рожына
Н. Я. Турышава
І. А. Фурманаў

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Змест


### Год Выгоцкага

*Г.Выготская.* Воспоминания об отце ........ 3
*В.П.Зинченко, Е.Б.Моргунов.* Наследие Л.С.Выготского ........ 2[illegible]

### Новыя даследаванні

*С.В.Кондратьева.* Проблемы психической регуляции педагогической деятельности и общения ........ 35
*Я.Л.Коломинский, В.А.Кривошеев.* О задачах этнопсихологических исследований ........ 43

### Госць нумара

*А.А.Бодалев.* Профессионализм ученого-психолога: характеристики и типология ........ 54

### Псіхалогія педагагічнага ўзаемадзеяння

*Т.У.Васілец.* Універсальнае аб'яднанне [illegible] формаў узаемадзеяння ў дыядзе ........ 66
*С.В.Талайко.* Изучение аналитичности-синтетичности стиля межличностного познания у учителей с различным стажем педагогической деятельности ........ 73

### Методыка выкладання псіхалогіі

*А.А.Амялькоў.* Псіхалогія развіцця ........ 79
*В.П.Дуброва.* Использование модели позиционного обучения при подведении итогов психолого-педагогических практик ........ 97

### Псіхолаг — псіхолагу

*Н.Г.Киселева.* Формирование индивидуальности в условиях школы для детей с задержкой психического развития ........ 105

### Энцыклапедыя практычнага псіхолага

*[illegible]Г.Сомова.* Изучение процессов осознания и атрибуции трудности в общении в подростковом и старшем школьном возрасте ........ 113

### Крызісная псіхалогія

*Ан Льети.* Самоубийство подростка ........ 119

### Пакой псіхалагічнай разгрузкі

*Л.А.Пергаменщик.* Почему надо любить себя ........ 123

Аўтары нумара ........ 127



© "Адукацыя і выхаванне", 1996
© Вокладка Г.В.Зайцаў, 1996


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



# ПСІХАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ

## Праграма для студэнтаў І курса факультэта прыкладной псіхалогіі

***А.А.Амялькоў***

### Тлумачальная запіска

Традыцыйна на многіх факультэтах педагагічнага універсітэта чытаецца невялікі курс узроставай і педагагічнай псіхалогіі (у аб'ёме 40 — 50 гадзін), які дае магчымасць будучым настаўнікам свядома засвоіць веды аб узроставых заканамернасцях псіхічнага развіцця асобы, пазнаёміцца з асаблівасцямі развіцця асобы школьніка на пэўных узроставых этапах. У гэтым жа курсе разглядаюцца асобныя заканамернасці развіцця школьніка ў навучанні і выхаванні, асаблівасці педагагічнай дзейнасці.Такія мазаічныя веды не зусім задавальняюць патрэбнасці факультэта прыкладной псіхалогіі, і таму ўзнікла неабходнасць распрацаваць больш поўны, у адпаведнасці з мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі будучых псіхолагаў, курс псіхалогіі развіцця асобы. Ён прынцыпова адрозніваецца ад традыцыйнага курса ўзроставай псіхалогіі тым, што разглядае развіццё не дыскрэтна, па пэўных узроставых перыядах, а бесперапынна, уключаючы і пераходныя перыяды. Асаблівая ўвага надаецца праблемам узраслення і сталення, разглядаюцца пытанні псіхічнага і асобаснага развіцця сталага чалавека, а таксама псіхічныя і асобасныя асаблівасці развіцця ў пажылым і старэчым узросце.

У дадзеным курсе не адмаўляецца поўнасцю дзейнасны падыход у псіхічным развіцці асобы, але апошні не лічыцца вядучым, як прымалася раней у айчыннай псіхалогіі. Поўнага ад-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

маўлення дзейнаснага падыходу ў псіхалогіі не можа быць па розных прычынах. Па-першае, склаліся традыцыі ў змесце і выкладанні псіхалагічнай навукі, якія адным разам нельга пераглед-зець. Па-другое, дзейнасны падыход мае права на існаванне як адзін з гістарычных накірункаў развіцця псіхалагічнай навукі. У прапануемым курсе належнае аддаецца гуманістычнай псіхалогіі, разглядаюцца і іншыя вядомыя ў сусветнай псіхалогіі падыходы.

Прапанаваны курс разлічаны на 160 гадзін.

1.УВОДЗІНЫ Ў ПСІХАЛОГІЮ РАЗВІЦЦЯ.

Прадмет псіхалогіі развіцця. Месца псіхалогіі развіцця ў сістэме псіхалагічных навук. Узаемасувязь псіхалогіі развіцця з агульнай, сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіяй. Задачы псіхалогіі развіцця. Структура псіхалогіі развіцця. Узроставая псіхалогія ў структуры псіхалогіі развіцця. Асноўныя паняцці і катэгорыі псіхалогіі развіцця.

Кароткія гістарычныя звесткі аб станаўленні псіхалогіі развіцця. Характарыстыка асноўных сучасных тэорый псіхічнага развіцця асобы. Біягенетычныя тэорыі. Псіхааналітычныя тэорыі. Псіхалагічныя тэорыі. Сацыялагічныя тэорыі.

Аб стане псіхалогіі развіцця на Беларусі.

Метадалагічныя прынцыпы псіхалогіі развіцця. Роля метадалагічных прынцыпаў у ідэалагізацыі псіхалагічных даследаванняў. Характарыстыка асноўных прынцыпаў гуманістычнай псіхалогіі. Паняцце аб метадах і методыках псіхалагічнага даследавання. Суадносіны метадалагічных прынцыпаў, метадаў і методык. Класіфікацыя метадаў па розных крытэрыях: працягласць даследавання, ход даследавання, задачы даследавання, умовы даследавання і г.д. Агульная характарыстыка назірання і саманазірання як метаду даследавання. Класіфікацыі назіранняў: суцэльныя і выбарачныя, бесперапынныя і дыскрэтныя, уключаныя і знешнія, стандартызаваныя і адвольныя. Тэхніка назірання і ўмовы яго арганізацыі. Апрацоўка і інтэрпрэтацыя вынікаў назірання.

Апытальныя метады: анкета, апытанне, гутарка, інтэрв'ю. Псіхалагічная характарыстыка апытальных метадаў. Магчымасці анкет. Адкрытыя, закрытыя, альтэрнатыўныя анкеты і анкеты-шкалы. Апытанне па спецыяльна распрацаваных схемах. Гутарка і яе месца ў псіхалагічных даследаваннях і карэкцыі псіхічнага развіцця асобы. Дыягнастычная і клінічная гутаркі. Асаблівасці апрацоўкі і інтэрпрэтацыі вынікаў гутаркі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аналіз дзейнасці асобы як метад даследавання ў псіхалогіі развіцця. Асаблівасці псіхалагічнага аналізу малюнкаў, вырабаў, пісьмовых прац (сачыненняў, апісанняў з'яў, пісьмовых адказаў на пытанні). Кантэнт-аналіз у псіхалагічных даследаваннях.

Бібліяграфічныя метады ў псіхалогіі. Метад «блізнятак» у псіхалогіі развіцця. Дыягнастычныя метады ў псіхалогіі развіцця. Тэсты і іх класіфікацыі. Дыягнастычныя метады для вывучэння развіцця пазнавальнай сферы асобы. (Тэст структуры інтэлекту Амтхаўэра, шкала даследавання інтэлекту дашкольніка і малодшага школьніка Векслера, шкала памяці Векслера, школьны тэст разумовага развіцця і інш.) Тэсты для вывучэння асаблівасцяў развіцця асобы (Мінесоцкі многааспектны асабовы апытальнік — MMPI), 16-фактарны асабовы апытальнік Кэтэла, тэст ААБІ (асабовы апытальнік Бехцераўскага інстытута), тэсты індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцяў асобы (Шмішэка, Айзенка, Люшэра і др.).

Праектыўныя тэсты і іх магчымасці (тэст Роршаха, методыка Розенцвейга і інш.)

Дыягнастычныя метады для вывучэння развіцця груп і індывідуальна-псіхалагічных паказчыкаў узаемадзеяння асобы ў малой групе (сацыяметрыя, аўтасацыяметрыя, рэферэнтаметрыя, тэхніка рэпертуарных рашотак Келі, метады групавой ацэнкі).

Эксперыментальныя метады ў псіхалогіі. Магчымасці лабараторнага эксперыменту. Натуральны эксперымент у псіхалогіі. Правядзенне палявога эксперыменту. Мадэліраванне ў псіхалагічных даследаваннях.

Метады апрацоўкі і інтэрпрэтацыі вынікаў псіхалагічнага даследавання. Паняцце аб якасным і колькасным аналізе вынікаў псіхалагічнага даследавання. Вымярэнні ў псіхалагічных даследаваннях. Меры цэнтральнай тэндэнцыі. Меры зменлівасці. Меры сувязі. Меры статыстычных адрозненняў. Меры даставернасці.

2. АГУЛЬНЫЯ ЗАКАНАМЕРНАСЦІ ПСІХІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ.

Умовы псіхічнага развіцця. Характарыстыка біялагічных умоў развіцця. Спадчыннасць і прыроджанасць. Сацыяльныя ўмовы псіхічнага развіцця. Уплыў мікраасяроддзя асобы на яе развіццё. Узровень развіцця грамадства і развіцця асобы. Суадносіны біялагічнага і сацыяльнага ў псіхічным развіцці асобы. Актыўнасць асобы. Патрэбнасці асобы як першакрыніца актыўнасці. Класіфікацыі патрэбнасцяў у псіхалогіі развіцця. Узроставыя патрэб-

РЕПОЗІТОРЫЙ БДПУ

насці асобы. Матывацыя актыўнасці. Аб суадносінах паміж патрэбнасцямі, матывамі і мэтамі актыўнасці. Рухаючыя сілы псіхічнага развіцця асобы. Характарыстыка супярэчнасцяў паміж узнікаючымі ўзроставымі патрэбнасцямі і магчымасцямі іх задавальнення. Іншыя супярэчнасці псіхічнага развіцця асобы. Механізмы псіхічнага развіцця асобы. Абвастрэнне супярэчнасцяў як крыніца ўзроставых крызісаў развіцця. Заканамернасці псіхічнага развіцця: нераўнамернасць, пластычнасць, кампенсацыя, сензітыўнасць.

Праблема ўзроставай перыядызацыі ў псіхалогіі. Аналіз розных падыходаў да праблемы. Стадыяльнасць развіцця інтэлекту ў Ж. Піажэ. Характарыстыка асноўных стадый псіхічнага развіцця дзіцяці па Валону.

Прынцыпы ўзроставай перыядызацыі ў працах Л. С. Выгоцкага, А. М. Лявонцьева, Д. Б. Эльконіна. Паняцце сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця асобы (Л. С. Выгоцкі, Л. І. Бажовіч, Я. Л. Каламінскі). Паняцце вядучага віду дзейнасці (А. М. Лявонцьеў, Д. Б. Эльконін, Д. І. Фельдштэйн). Механізмы перыядычнасці ў развіцці. Супярэчнасці развіцця. Узроставыя крызісы развіцця і асаблівасці іх праходжання. Кароткая характарыстыка ўзроставых перыядаў псіхічнага развіцця па Д. Б. Эльконіну.

Стадыяльнасць развіцця асобы. Суадносіны стадыяльнасці псіхічнага развіцця і стадыяльнасці развіцця асобы. Стадыі развіцця асобы па Э. Эрыксану. Узроўні і стадыі маральнага развіцця асобы па Л. Кольбергу. Жаноцкая канцэпцыя маральнага развіцця (па Гілліган). Аналіз падыходаў да стадыяльнасці псіхічнага развіцця ў псіхааналізе, кагнітыўнай псіхалогіі, у тэорыі інтэнцыянальнасці (Бюлер).

Праблема суадносін навучання і псіхічнага развіцця асобы. Тэорыя Ж. Піажэ аб функцыях інтэлекту і стадыях яго развіцця. Арганізацыя і адаптацыя як асноўныя функцыі развіцця інтэлекту. Абмежаванасць навучання ў развіцці інтэлекту.

Навучанне як спецыяльная мэтанакіраваная дзейнасць дзеля псіхічнага развіцця. Л. С. Выгоцкі аб вядучай ролі навучання ў псіхічным развіцці асобы. Узроўні псіхічнага развіцця: узровень актуальнага развіцця і зона бліжэйшага развіцця. Ідэі Л. С. Выгоцкага аб ролі авалодання знакамі ў псіхічным развіцці дзяцей.

3. РАЗВІЦЦЁ ПСІХІКІ ДЗІЦЯЦІ ДА ШКОЛЫ.

Аб уплыве прэнатальнага перыяду развіцця і крызісу нараджэння на далейшае псіхічнае развіццё. Вантробны перыяд і стадыі яго развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асаблівасці развіцця вышэйшай нервовай дзейнасці дзіцяці ў перыяд нованароджанасці. Комплекс ажыўлення. Асаблівасці развіцця псіхікі немаўляці. Патрэбнасці ўзросту. Эмацыянальныя зносіны дзіцяці з дарослымі і іх роля ў развіцці псіхікі. Развіццё рэцэпторнай і рухальнай сфер немаўляці. Развіццё мовы. Характарыстыка псіхічных новаўтварэнняў узросту.

Псіхічнае развіццё ў раннім дзяцінстве. Авалоданне хадзьбой і яе значэнне ў псіхічным жыцці дзіцяці. Сенсорна-перцэптыўнае развіццё. Сенсорныя эталоны. Асаблівасці развіцця мовы ў раннім дзяцінстве. Роля прадметна-маніпулятыўнай дзейнасці ў развіцці дзіцяці.

Крызіс трох гадоў і яго характарыстыка. Сацыяльная сітуацыя псіхічнага развіцця дашкольніка. Асаблівасці развіцця пазнавальных псіхічных працэсаў у дашкольнікаў: адчуванняў, успрымання, памяці, мыслення, уяўленняў. Развіццё мовы дашкольнікаў. Пачатак развіцця асобы. Самасвядомасць. Дыферэнцыяцыя пры ўспрыманні людзей. Унутраная карціна свету. Самаацэнка. Развіццё матывацыйна-патрэбнаснай сферы дашкольніка. Асаблівасці развіцця пачуццяў і эмоцый дашкольніка. Характарыстыка развіцця валявой сферы дзяцей дашкольнага ўзросту. Развіццё здольнасцяў дзіцяці. Фарміраванне характару. Псіхалагічная характарыстыка дзейнасці дашкольнікаў. Сюжэтна-ролевая гульня як вядучы від дзейнасці ў псіхічным развіцці дзяцей дашкольнага ўзросту. Асаблівасці псіхічнага развіцця дзяцей шасцігадовага ўзросту. Шасцігадовае дзіця як асоба. Змены ва ўнутранай карціне свету шасцігодак. Паняцце псіхалагічнай гатоўнасці шасцігодак да навучання ў школе. Пазнавальная, асобасная і сацыяльна-псіхалагічная падрыхтаванасць дзяцей да навучання ў школе. Паняцце матывацыйнай, эмацыянальнай, валявой, маральнай падрыхтаванасці шасцігодак да навучання ў школе. Асаблівасці адаптацыі шасцігодак да новых умоў узаемадзеяння ў школьным класе. Узроўні самарэгуляцыі шасцігодак.

## 4. ПСІХАЛОГІЯ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНІКА.

Агульная характарыстыка ўзроставага крызісу сямі год. Фазы крызісу. Адрозненні сямігадовага дзіцяці ад шасцігадовага. Праяўленні феноменаў Піажэ. Эгацэнтрычнасць мыслення і мовы. Агульная характарыстыка сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця асобы малодшага школьніка. Асаблівасці фізічнага і анатамафізіялагічнага развіцця дзяцей гэтага ўзросту. Змена сацыяльнага становішча дзіцяці ў сувязі з паступленнем яго ў школу. Асэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

саванне і перажыванне малодшымі школьнікамі свайго асаблівага стану вучня. Унутраная пазіцыя школьніка (Л. І. Бажовіч). Перабудова адносін асобы да сябе і іншых людзей.

Праяўленне новых узроставых патрэбнасцяў дзіцяці. Змена сістэмы інтарэсаў і матывацыі паводзін. Асаблівасці развіцця у дзіцяці станоўчых адносін да навучання.

Самасвядомасць і самаацэнка асобы ў малодшым школьным узросце. Развіццё самапазнання ў малодшых школьнікаў. Уяўленні аб сабе — аснова развіцця самаацэнкі. Устойлівасць і адэкватнасць самаацэнкі. Узроўні самаацэнкі. Роля вучэбнай дзейнасці ў развіцці самаацэнкі. Уплыў зносін вучняў у класе на развіццё самаацэнкі малодшых школьнікаў.

Асаблівасці ўзаемаадносін малодшых школьнікаў у класе. Статус вучня ў сістэме міжасобасных адносін і яго ўплыў на развіццё асобы. Самаацэнка і дамаганні вучня ў сістэме адносін. Уплыў узроўню сацыяльна-псіхалагічнага камфорту ў класе на развіццё асобы. Асноўныя прыёмы і метады дыягностыкі і карэкцыі паказчыкаў сацыяльна-псіхалагічнага камфорту ў школьным класе.

Псіхалагічная характарыстыка дзейнасці малодшага школьніка. Асаблівасці гульні малодшага школьніка. Вучэбная дзейнасць і яе структура. Матывацыя вучэбнай дзейнасці ў малодшых школьнікаў. Вучэбныя дзеянні і іх характарыстыка. Веды, уменні і навыкі як сродкі псіхічнага развіцця асобы ў вучэбнай дзейнасці. Роля ўменняў і навыкаў самакантролю ў вучэбнай дзейнасці для псіхічнага развіцця дзяцей. Асаблівасці псіхічнага развіцця малодшага школьніка ў працоўнай дзейнасці. Засваенне маральных нормаў асобы ў працоўнай дзейнасці. Развіццё асобы ў творчай дзейнасці (канструктарскай, выяўленчай, мастацкай і г.д.).

Асаблівасці развіцця пазнавальнай сферы малодшых школьнікаў. Развіццё ўвагі. Суадносіны адвольнай і неадвольнай увагі малодшых школьнікаў. Асаблівасці развіцця ўласцівасцяў увагі: аб'ему, размеркавання, устойлівасці, пераключэння. Паняцце ўважлівасці дзіцяці. Станы ўважлівасці: сапраўдная ўважлівасць, несапраўдная ўважлівасць, сапраўдная няўважлівасць, несапраўдная няўважлівасць. Асаблівасці фарміравання адвольнай увагі малодшых школьнікаў у вучэбнай дзейнасці.

Развіццё ўспрымання малодшых школьнікаў. Асаблівасці ўспрымання формы малодшымі школьнікамі. Асаблівасці ўспрымання малодшымі школьнікамі часу. Успрыманне сюжэтнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

карцінкі. Развіццё ўспрымання малодшымі школьнікамі вучэбнага матэрыялу.

Памяць. Асаблівасці запамінання малодшымі школьнікамі. Суадносіны механічнага і свядомага запамінання ў малодшых школьнікаў. Развіццё адвольнасці і асэнсаванасці запамінання. Асаблівасці ўзнаўлення. Сістэматызацыя і абагульненні пры ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу. Рэмінісцэнцыя. Асаблівасці забывання ў малодшых школьнікаў. Узроставыя асаблівасці памяці малодшых школьнікаў. Памяць на вобразы. Канкрэтнасць матэрыялу. Аб'ём памяці. Значнасць матэрыялу для асобы. Метады вывучэння ўласцівасцяў памяці. Прыёмы развіцця памяці. Метад асацыяцый. Метады стымулявання і двайнога стымулявання. Мнематэхнічныя метады.

Мысленне. Агульная характарыстыка развіцця мыслення малодшых школьнікаў у вучэбнай дзейнасці. Паняцці і іх асаблівасці ў малодшых школьнікаў. Прадметныя паняцці і паняцці адносін. Стадыяльнасць засваення прадметных паняццяў. Асаблівасці засваення паняццяў адносін. Асаблівасці аналізу малодшых школьнікаў. Асаблівасці сінтэзу. Характарыстыка параўнання малодшымі школьнікамі. Канкрэтызацыя. Абстракцыя, абагульненне, класіфікацыя ў малодшых школьнікаў. Суадносіны тэарэтычнага і эмпірычнага мыслення. Тэарэтычнае мысленне і псіхічныя новаўтварэнні ўзросту. Развіццё маўлення малодшага школьніка. Асаблівасці пісьмовай мовы. Асаблівасці чытання і разумення тэксту. Інтэрыярызацыя матэрыялу пры чытанні. Формы моўных паводзін дзяцей: гаварэнне ўслых, прагаворванне шэпатам, рэдуцыраваны шэпт, бязгучнае шавяленне вуснамі, шавяленне вуснамі толькі пры цяжкасці ўспрымання матэрыялу, чытанне вачыма. Развіццё фанетычнага боку мовы. Развіццё граматычнага боку мовы. Развіццё лексікі ў малодшых школьнікаў.

Уяўленні. Суадносіны рэпрадуктыўных і творчых уяўленняў у малодшых школьнікаў. Фантазіі малодшых школьнікаў. Механізмы ўзнікнення ўяўленняў. Уяўленні і псіхічныя новаўтварэнні малодшага школьнага ўзросту.

Асаблівасці разумовага развіцця малодшых школьнікаў. Развіццёвае навучанне і яго месца ў развіцці малодшых школьнікаў. Здольнасць да навучання, самастойнасць і эканамічнасць як паказчыкі разумовага развіцця. Прынцыпы сістэмы Л. В. Занкова ў развіцці малодшых школьнікаў. Навучанне на высокім узроўні цяжкасці. Вядучая роля тэарэтычных ведаў. Хуткі тэмп у развіцці. Усведамленне школьнікамі працэсу развіцця. Роля школьнай ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знакі ў развіцці асобы малодшага школьніка. Фарміраванне разумовых дзеянняў. Паэтапнае фарміраванне разумовых дзеянняў.

Агульная характарыстыка эмацыянальнай сферы малодшага школьніка. Імпульсіўнасць эмоцый. Развіццё стрыманасці эмоцый. Характарыстыка пераважнага эмацыянальнага стану для малодшага школьніка. Развіццё маральных пачуццяў. Асаблівасці ўзнікнення і развіцця інтэлектуальных пачуццяў у малодшых школьнікаў. Праяўленне эмоцый здзіўлення, задавальнення, расчаравання, сумнення, зацікаўленасці. Эстэтычныя пачуцці. Рашэнне ўнутраных супярэчнасцяў як механізм узнікнення пачуццяў.

Асаблівасці валявых дзеянняў малодшых школьнікаў. Самастойнасць, стрыманасць, настойлівасць як утварэнні валявой сферы малодшых школьнікаў.

Праяўленне індывідуальных асаблівасцяў малодшымі школьнікамі.

5. ПРАБЛЕМА ЎЗРАСЛЕННЯ Ў ПСІХАЛОГІІ РАЗВІЦЦЯ.

Паняцце ўзраслення ў псіхалогіі. Палавое паспяванне і ўзрасленне. Біялагічныя аспекты палавога паспявання і ўзраслення. Рост чалавека і змяненне яго прапорцый. Функцыянальныя і марфалагічныя змены розных сістэм арганізма. Гарманальная рэгуляцыя і палавая спеласць. Вонкавыя прызнакі палавога паспявання. Фактары, якія ўплываюць на рост цела і ход палавога паспявання. Парушэнні ў працэсе паспявання. Нармальнае развіццё. Акселерацыя. Узаемадзеянне розных фактараў развіцця.

Псіхалагічныя аспекты ўзраслення. Успрыманне і прыстасаванне да фізічных змен. Павышаная ўвага да цела, органаў і іх функцый. Абмежаванасць успрымання часовай перспектывы. Адчуванне асобаснай ідэнтычнасці. Абвостраная сацыяльная рэакцыя на фізічныя змены. Фізічныя змены і самаацэнка. Кагнітыўнае развіццё. Новыя кагнітыўныя структуры: камбінаторыка, гіпатэтычнае мысленне, ідэальныя ўяўленні. Развіццё агульнага інтэлекту. Здольнасць да інтраспекцыі. Сувязь паміж афектыўнымі і кагнітыўнымі функцыямі.

Асобаснае развіццё пры ўзрасленні. Агульная характарыстыка станаўлення асобы. Асноўныя патрэбнасці і тыповыя эмацыянальныя рэакцыі ў перыяд узраслення. Іерархічная класіфікацыя патрэбнасцяў па Маслоу. Фізіялагічныя патрэбнасці. Патрэбнасць у бяспецы. Патрэбнасць у каханні і прывязанасці. Патрэбнасць у сацыяльным статусе. Патрэбнасць у самарэалізацыі і самапава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ае. Тыпы рэагавання: эмацыянальная нераўнавага, нападзенне ці адступленне, ідэалізм. Устаноўкі і пазіцыі. Каштоўнасныя арыентацыі і іх развіццё. Маральнае развіццё. Стадыяльнасць маральнага развіцця па Кольбергу. Агульныя рысы маральнага развіцця ў перыяд узраслення. Перагляд каштоўнасных уяўленняў і адрыў ад рэферэнтных асоб. Лібералізацыя каштоўнасных уяўленняў. Перанос функцый узору з бацькоў на рэферэнтную групу. Асіміляцыя каштоўнасных уяўленняў адпаведнай культуры. Развіццё «я» і набыццё ідэнтычнасці ў перыяд узраслення. Сексуальнасць і партнёрства. Палавая спеласць і палавая роля. Сексуальнае развіццё да падлеткавага ўзросту. Сексуальныя інтарэсы і сексуальныя паводзіны ў перыяд узраслення. Палавыя адрозненні ў сексуальных паводзінах. Палавая спецыфіка набыцця і развіцця палавых роляў у перыяд узраслення. Роля сям'і ў перыяд узраслення. Працэс аддзялення ад сям'і з пункту погляду бацькоў. Погляд моладзі на аддзяленне ад сям'і. Сямейная згуртаванасць і канфлікты паміж бацькамі.

Псіхасацыяльныя аспекты ўзраслення. Фактары, якія стымулююць узрасленне. Сацыяльнае становішча асобы. Рэферэнтная група. Часовыя групоўкі. Ідэалогія юнацтва (юнацкая рэлігія). Выбар прафесіі. Псіхасацыяльная сталасць.

6. ПСІХІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў ПЕРАХОДНЫЯ ПЕРЫЯДЫ.

Паняцце пераходнага перыяду ў псіхічным развіцці. Роля пераходнага перыяду ў далейшым развіцці асобы. Неабходнасць вывучэння псіхічнага развіцця асобы ў пераходны перыяд.

Паняцце ўзроставага крызісу псіхічнага развіцця. Асаблівая сацыяльная сітуацыя псіхічнага развіцця ў крызісны перыяд. Змена патрэбнасцяў у час пераходу ад аднаго ўзроставага перыяду да другога. Несвядомая матывацыя ў паводзінах. Неразуменне навакольнымі (дарослымі і аднагодкамі) змены перажыванняў асобы, якая знаходзіцца ў пераходным перыядзе. Розныя формы праходжання крызісаў развіцця. Парушэнне палавога развіцця. Крызісы ідэнтычнасці і аўтарытэтаў. Перажыванне адчужэння (дэперсаналізацыі і дэрэалізацыі). Парушэнне ацэнкі свайго фізічнага аблічча (дысмарфафобія). Нарцыстычныя крызісы. Суіцыдныя ўчынкі.

Шляхі пераадольвання крытычных перыядаў у псіхічным развіцці. Псіхалагічныя ахоўныя механізмы. Актыўная дзейнасць асобы ў пераходны перыяд. Спецыяльная псіхалагічная дапамога асобе ў крытычныя перыяды.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Развіццё інтэлекту ў пераходны перыяд. Эмацыянальна-валявая сфера асобы. Асаблівасці развіцця асобы ў пераходны перыяд.

7. ПСІХАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ ПАДЛЕТКА.

Псіхалагічная роля і месца падлеткавага ўзросту ў антагенезе. Тэарэтычныя погляды на праблему падлеткавага ўзросту.

Характарыстыка ўзроставага крызісу пры пераходзе ад малодшага школьнага ўзросту да падлеткавага. Узроставыя патрэбнасці падлетка і іх вонкавыя праяўленні. Магчымасці задавальнення ўзроставых патрэбнасцяў. Прычыны абвастрэння супярэчнасцяў псіхічнага развіцця асобы. Змяненне сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця ў пераходны перыяд. Змена адносін падлетка да свайго фізічнага і палавога развіцця. Змена адносін падлетка да асноўных відаў дзейнасці. Кансерватызм дарослых у адносінах да дзяцей у пераходны перыяд. Умовы, якія спрыяюць вырашэнню канфліктаў, звязаных з узроставым крызісам. Умовы, якія ўскладняюць праходжанне ўзроставага крызісу. Паняцце «цяжкі ўзрост» і прычыны яго ўзнікнення. Працягласць узроставага крызісу.

Характарыстыка сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця падлетка. Вядучыя патрэбнасці ўзросту. Матывацыя актыўнасці падлетка. Імкненне падлеткаў да дарослаcці. Неадпаведнасць паміж дамаганнямі на дарослаcць і рэальнымі паводзінамі падлеткаў. Змяненне ролі перайманне дарослых. Узнікненне валявога свядомага кантролю за перайманнем дарослых.

Міжасобасныя зносіны як вядучы від дзейнасці ў развіцці падлеткаў. Структура міжасобасных зносін у малой групе падлеткаў. Змест міжасобасных зносін. Накіраванасць зносін падлеткаў. Самапазнанне ў міжасобасных зносінах. Параўнанне сябе з аднагодкамі і дарослымі. Самавыяўленне падлеткаў у міжасобасных зносінах. Развіццё індывідуальнасці асобы. Самасцвярджэнне падлеткаў. Развіццё самасвядомасці ў падлеткавым узросце. Вобраз «я». Суадносіны ў структуры вобраза «я» кагнітыўнай (веды аб сабе) і афектыўнай (адносіны да сябе) частак. Асаблівасці фарміравання самаацэнкі ў падлеткаў. Роля самаацэнкі ў самарэгуляцыі падлетка. Развіццё каштоўнасных арыентацый.

Сяброўства падлеткаў. Асаблівасці ўзаемаадносін з супрацьлеглым полам.

Асаблівасці развіцця пазнавальнай сферы падлетка. Характарыстыка развіцця ўвагі. Асаблівасці развіцця адчуванняў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўспрымання падлеткамі навакольнага свету. Мнемічная дзейнасць падлетка. Асаблівасці развіцця мыслення і ўяўленняў дзяцей у падлеткавым узросце. Стадыя фармальных аперацый мыслення. Асаблівасці мовы падлетка.

Асаблівасці развіцця эмацыянальна-валявой сферы падлетка. Праяўленне асноўных функцый эмоцый падлеткамі. Рэгулятыўная, сігнальная, ацэначная, стымулюючая, ахоўная функцыі эмоцый. Інтэнсіўнасць, працягласць, глыбіня, свядомасць, умовы ўзнікнення і знікнення эмоцый у падлетка. Спосабы выказвання эмоцый падлеткамі. Эмоцыі ў рэгуляцыі міжасобасных зносін. Узнікненне сумлення ў падлеткаў. Развіццё волі ў падлеткаў. Замацаванне свядомай маральнай рэгуляцыі ўчынкаў як утварэнне падлеткавага ўзросту. Выхаванне валявых якасцяў падлеткамі.

Маральнае развіццё падлетка. Узнікненне аўтаномных маральных меркаванняў. Стадыі канвенцыянальнага ўзроўню развіцця маральнай свядомасці (10 — 13 гадоў) па Кольбергу.

Развіццё асобы падлетка ў вучэбнай, мастацкай, творчай і другіх відах дзейнасці. Стварэнне спецыяльных вучэбных груп з мэтай асобаснага развіцця падлеткаў. Асаблівасці развіцця падлеткаў у рознаўзроставых групах.

## 8. ПСІХІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў ПЕРАХОДНЫ ПЕРЫЯД АД ПАДЛЕТКАВАГА ДА РАННЯГА ЮНАЦКАГА ЎЗРОСТУ.

Узнікненне новых узроставых патрэбнасцяў у старэйшых падлеткаў. Асаблівасці сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця асобы ў пераходны перыяд. Узнікненне новых адносін да сябе як дарослага чалавека. Змены ў разуменні свайго месца і адносін з іншымі людзьмі. Адносіны да школы і навучання. Змены ў адносінах да школьнай адзнакі. Змены ў матывацыі вучобы. Пазнавальныя інтарэсы. Асаблівасці асобаснай рэфлексіі ў пераходны перыяд. Асаблівасці міжасобаснага ўспрымання. Уплыў спецыфічнай арыентацыі на будучае на ўспрыманне навакольнай рэчаіснасці. Задаволенасць сучасным і імкненне ў будучае. Часовыя перспектывы асобы ў пераходны перыяд. Змены ў структуры самасвядомасці. Асаблівасці развіцця кагнітыўнага боку самасвядомасці. Узнікненне самапрэзентацыі. Развіццё эмацыянальнага боку самасвядомасці. Змены ў эмацыянальных адносінах да сябе. Развіццё рэгуляцыйнага боку самасвядомасці. Агульныя характарыстыкі самасвядомасці ў пераходны перыяд. Роля зносін у развіцці самасвядомасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

9. ПСІХІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў РАННІМ ЮНАЦТВЕ.

Характарыстыка сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця у юнацкім узросце. Узнікненне праблемы маральнага выбару «Кім быць?» і «Якім быць?». Адкрытасць да абмеркавання маральных пытанняў з аднагодкамі і дарослымі. Зварот да крыніц маралі, якімі карыстаюцца дарослыя. Маральныя катэгорыі дабра і зла. Узнікненне і праяўленне новых маральных рысаў характару: сумленнасці, прыстойнасці, шчырасці. Характэрныя рысы маральнага самавызначэння сучасных юнакоў і дзяўчат.

Станаўленне светапогляду. Узнікненне новых пазіцый і адносін у асобы юнацкага ўзросту (сацыяльных, палітычных, рэлігійных, нацыянальных, культурных, эканамічных і інш.). Юнацкія ідэалогіі і рэлігіі. Рэферэнтныя групы ў фарміраванні сацыяльных пазіцый. Асаблівасці фарміравання светапогляду асобы ў сучасных умовах. Адсутнасць прымусовага сацыяльна-палітычнага арыентавання з боку старэйшых. Плюралізм і супярэчнасць думак у грамадстве. Уплыў зменлівасці эканамічнай і палітычнай сітуацый на маральнае развіццё асобы ў раннім юнацтве. Цяжкасці ў выбары маральных крытэрыяў у фарміраванні светапогляду. Нацыянальная ідэя ў светапоглядзе юнакоў. Праблемы сувязі і ўзаемапранікнення навукі і рэлігіі.

Маральнае і прафесійнае самавызначэнне. Пошукі адказаў на пытанні:«Куды пайсці?», «Кім быць?», «Якім быць?». Аналіз «я»-вобраза асобы ў раннім юнацтве. Суадносіны паміж рэальным, ідэальным і будучым «я». Асноўныя супярэчнасці псіхічнага развіцця асобы. Акцэнтуацыя характару ў старшакласнікаў. Узнікненне і развіццё матывацыі выбару прафесіі ў вучэбна-прафесійнай дзейнасці. Характарыстыка вучэбна-прафесійнай дзейнасці як вядучага віду ў псіхічным развіцці асобы ў раннім юнацтве. Праяўленне прафесійных інтарэсаў і схільнасцяў. Узнікненне прагматызму ў прафесійным станаўленні.

10. ПСІХІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў ЮНАЦТВЕ.

Паняцце юнацтва і яго ўзроставыя межы. Характарыстыка сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця асобы ў юнацкім узросце. Псіхалагічная падрыхтаванасць да змены сацыяльнага наваколля ў сувязі з заканчэннем школы або вучылішча. Змяненне і ўзнікненне новых сацыяльных пазіцый (атрыманне пашпарта, вайсковага прыпіснога пасведчання, выбарчага права, права юрыдычнай асобы, права ўступаць у шлюб і інш.) і ўплыў іх на асобаснае развіццё юнакоў. Узнікненне новых узроставых пат-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

рэбнасцяў. Абвастрэнне ўзроставага крызісу абмежаванасцю вучэбна-прафесійнай дзейнасці ў задавальненні ўзроставых патрэбнасцяў. Імкненне да аўтаноміі ва ўзаемаадносінах з дарослымі. Варыянты часовай перспектывы асобаснага развіцця. Адносіны да сябе, свайго цела, яго органаў і функцый. Усведамленне свайго фізічнага і фізіялагічнага развіцця як дарослага чалавека. Поларолевая дыферэнцыяцыя. Узнікненне патрэбнасці ў закаханасці. Закаханасць і каханне. Інтымна-асобасныя зносіны як вядучы від дзейнасці ў псіхічным развіцці асобы. Эротыка і секс у развіцці асобы ў юнацтве. Механізмы праяўлення псіхічных новаўтварэнняў узросту. Узнікненне ідэалаў. Жыццёвыя планы. Жыццёвыя мары. Рэальныя і нерэальныя мары. Першае каханне, рамантычныя і інтымныя адносіны і іх роля ў далейшым лёсе чалавека. Працэс аддзялення ад сям'і бацькоў і стварэнне сваёй сям'і як мара ў юнацтве.

## 11. РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў СТАРЭЙШЫМ ЮНАЦКІМ УЗРОСЦЕ.

Узроставыя межы старэйшага юнацкага ўзросту. Сацыяльныя прычыны дзялення юнацкага ўзросту на тры перыяды: ранняе юнацтва, юнацтва і старэйшае юнацтва. Характарыстыка сацыяльнай сітуацыі псіхічнага развіцця. Узроставыя патрэбнасці старэйшага юнацкага ўзросту. Абмежаванасць інтымна-асобасных зносін у задавальненні ўзроставых патрэбнасцяў. Задаволенасць ажыццяўленнем жыццёвых планаў. Палавая дыферэнцыяцыя ў развіцці асобы ў старэйшым юнацкім узросце. Альтруістычныя патрэбнасці жанчыны ў аказанні дапамогі, патрэбнасці даглядаць за іншымі людзьмі і дзецьмі. Пачуццё мацярынства. Развіццё адносін жанчыны да мужчыны. Іерархія патрэбнасцяў мужчын, якія рэалізуюцца ў зносінах і шлюбных адносінах з жанчынай.

Развіццё самасвядомасці асобы. Выкарыстанне жыццёвага вопыту ў самарэгуляцыі паводзін. Усведамленне свайго жыццёвага шляху. Змяненні ў структуры і змесце вобраза «я». Узровень дамаганняў. Узнікненне свядомай абмежаванасці ва ўзроўні дамаганняў. Удасканаленне самаацэньвання асобай вобраза «я». Развіццё каштоўнасных арыентацый асобы. Ідэалы асобы ў старэйшым юнацкім узросце. Удасканаленне ідэалаў, якія прымаюцца як узор паводзін. З'яўленне ідэалаў, якія адмаўляюцца як узор паводзін. Асаблівасці развіцця міжасобасных зносін і адносін у малых групах па месцы працы ці вучобы. Развіццё міжасобасных зносін асобы ў сям'і. Развіццё адносін да дзяцей. Перанос вопыту сям'і бацькоў на развіццё адносін у сваёй сям'і. Развіццё асо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бы ў зносінах і дзейнасці ва ўмовах сям'і. Адзіноцтва. Асаблівасці зносін і паводзін маладых людзей, якія не знаходзяцца ў шлюбных адносінах.

Развіццё асобы ў працоўнай дзейнасці. Змяненне матывацыйна-патрэбнаснай сферы. Асаблівасці развіцця пазнавальнай сферы асобы ў старэйшым юнацкім узросце. Патрэбнасць у кагнітыўнай гармоніі асобы.

## 12. ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ Ў СТАЛЫМ УЗРОСЦЕ

Паняцце сталага ўзросту ў псіхалогіі развіцця. Праблема ўзроставай перыядызацыі развіцця асобы ў сталым узросце. Прынцыпы ўзроставай перыядызацыі сталага ўзросту. Узроставы крызіс пры пераходзе асобы ад юнацтва да сталасці. Патрэбнасці асобы ў першай стадыі сталага ўзросту. Палавыя адрозненні ва ўнутранай карціне свету асобы. Магчымасці задавальнення ўзроставых патрэбнасцяў у сямейных адносінах і выхаванні дзяцей. Праяўленне ўзроставых патрэбнасцяў ва ўзаемадзеянні асобы з іншымі людзьмі. Роля сацыяльнага статуса асобы на яе развіццё. Асаблівасці задавальнення ўзроставых патрэбнасцяў асобы ў дзейнасці. Далейшае развіццё светапогляду асобы ў першай стадыі сталасці. Праяўленне новаўтварэнняў асобаснага развіцця.

Развіццё патрэбнасцяў дарослага чалавека. Узнікненне генератыўнасці (адчуванне неабходнасці захавання роду). Развіццё інтарэсу да наступнага пакалення. Узрастанне прадукцыйнасці і стваральнасці ў розных сферах дзейнасці. Эвалюцыя шлюбных адносін. Далейшае развіццё самасвядомасці. Павага да мудрасці. Далейшая сацыялізацыя адносін у розных малых групах. Эмацыянальная гібкасць у адносінах з людзьмі. Пошук новых форм паводзін.

Перажыванне ўзроставага крызісу дарослымі пасля сарака гадоў. Узнікненне і далейшае развіццё ўзроставых патрэбнасцяў. Магчымасці задавальнення патрэбнасцяў пасля сарака гадоў. Прадукцыйнасць і стваральнасць асобы. Узнікненне новых перажыванняў, звязаных з адасабленнем дзяцей і засваеннем новых сацыяльных роляў. Перажыванне сваяцкіх адносін, якія ўзніклі ў выніку ўтварэння дзецьмі сем'яў. Далейшае развіццё вобраза «я». Самаацэнка і ўзровень дамаганняў у асобы пасля сарака гадоў. Асаблівасці развіцця ўзаемадзеяння асобы з іншымі людзьмі. Далейшы пошук новых форм паводзін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заключная стадыя сталага ўзросту. Характэрныя асаблівасці сацыяльнай сітуацыі развіцця асобы пасля пяцідзесяці гадоў. Развіццё аўтэнтычнай генератыўнасці асобы. З'яўленне перавагі жыццёвай мудрасці над фізічным станам. Узмацненне сацыялізацыі адносін і паслабленне сексуалізацыі адносін. Далейшая эвалюцыя сямейных адносін. Магчымае ўзнікненне стагнацыі ў шлюбных адносінах. Магчымае афектыўнае збядненне асобы ў сувязі з смерцю сваіх бацькоў ці блізкіх людзей. Асаблівасці развіцця асобы на заключнай стадыі сталага ўзросту ў працоўнай дзейнасці. Асаблівасці паводзін асобы гэтага ўзросту ў вольны час. Характэрныя асаблівасці развіцця асобы ў сталым узросце.

## 13. РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў ПАЖЫЛЫМ УЗРОСЦЕ

Праблема развіцця асобы ў пажылым узросце. Межы пажылога ўзросту. Сацыяльныя і біялагічныя ўмовы ўзнікнення ўзроставага крызісу пры пераходзе ад сталага да пажылога ўзросту. Характар праходжання ўзроставага крызісу. Роля жыццёвага вопыту ў вырашэнні супярэчнасцяў развіцця асобы. Значэнне адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі асобы ў зняцці асобных супярэчнасцяў яе развіцця. Неадэкватнасць успрымання сябе і сваіх магчымасцяў у пажылым узросце. Усведамленне фактаў пагаршэння здароўя і старэння цела. Узнікненне самазаклапочанасці.

Асаблівасці падтрымання развіцця асобы ў пажылым узросце ў працоўнай дзейнасці і міжасобасным узаемадзеянні асобы ў працоўным калектыве. Значэнне захавання стэрэатыпаў узаемадзеяння асобы на падтрыманне яе развіцця. Асаблівасці ўзаемадзеяння асобы пажылога ўзросту ў сям'і.

Асаблівасці самасвядомасці асобы ў пажылым узросце. Дасягненне чалавекам цэласці свайго жыццёвага шляху. Падвядзенне вынікаў свайго жыцця і імкненне дапоўніць яго. Узнікненне разумення таго, што ўсё пачынаць зноў немагчыма. Характэрныя асаблівасці развіцця асобы ў пажылым узросце.

## 14. РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ Ў СТАРЭЧЫМ УЗРОСЦЕ.

Паняцце старэчага ўзросту ў герантапсіхалогіі. Межы старэчага ўзросту. Сацыяльная сітуацыя падтрымання асобы. Роля навакольнага сацыяльнага асяроддзя ў падтрыманні асобы. Пераацэнка ўласнага «я» і прыняцце пакоя. Звяртанне ва ўспамінах да далёкага мінулага. Усведамленне пагаршэння свайго здароўя. Адмаўленне смерці і жаданне жыць. Набліжэнне да смерці. Уз-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

нікненне гневу і нежаданне паміраць. Дэпрэсія. Паступовае ўзнікненне жадання пакінуць жыццё. Фарміраванне падрыхтаванасці да смерці. Пакорлівае чаканне свайго канца. Смерць.

15. ЗНАЧЭННЕ ВЕДАЎ ПА ПСІХАЛОГІІ РАЗВІЦЦЯ ДЛЯ ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І ЖЫЦЦЯ.

Агульная характарыстыка ведаў па псіхалогіі развіцця. Жыццёвыя псіхалагічныя веды. Навуковыя паняцці і катэгорыі. Нарматыўныя псіхалагічныя веды. Роля статыстычных метадаў у атрыманні псіхалагічных ведаў. Мадэліраванне псіхалагічных з'яў. Псіхалагічныя веды, якія атрымліваюцца з дапамогай мадэліравання псіхічнага і асобаснага развіцця.

Патрэбнасці грамадства ў ведах па псіхалогіі развіцця. Псіхалагічная экалогія. Уздзеянне грамадскіх падзей і сацыяльных з'яў на псіхіку чалавека.

Абгрунтаванне неабходнасці ведаў па псіхалогіі развіцця для прыкладной псіхалогіі. Патрэбнасць у псіхалагічных ведах практычных псіхолагаў, настаўнікаў, выхавацеляў, арганізатараў сістэмы адукацыі.

Псіхалагічная культура грамадства. Роля ведаў па псіхалогіі развіцця ў жыцці кожнага чалавека. Прапаганда псіхалагічных ведаў.

*Амонашвили Ш.А.* В школу — с шести лет. — М., 1986.
*Ананьев Б.Г.* Избранные психологические труды: В 2 т. — М., 1980.
*Асеев В.Г.* Возрастная психология: Учебное пособие. — Иркутск, 1989.
*Байярд Р.Т., Байярд Д.* Ваш беспокойный подросток. — М., 1991.
*Бауер Т.Дж.Р.* Психическое развитие младенца. — М., 1979.
*Бернс Р.В.* Развитие Я-концепции и воспитание. — М., 1986.
*Божович Л.И.* Личность и ее формирование в детском возрасте. — М., 1968.
*Бреслав Г.М.* Эмоциональные особенности формирования личности в детстве: норма, отклонения. — М., 1990.
*Брунер Д.С.* Психология познания: за пределами непосредственной информации. — М., 1977.
*Бурменская Г.В., Обухова Л.Ф., Подольский А.А.* Современная американская психология развития: учебное пособие. — М., 1986.
*Валон А.* Психическое развитие ребенка. — М., 1967.
Возрастная и педагогическая психология / Под ред. М. В. Гамезо и др. — М., 1984.
Возрастная и педагогическая психология / Под ред. А. В. Петровского. — М., 1979.
*Выготский Л.С.* Собрание сочинений: В 6 т. — М., 1984.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Гальперин П.Я., Запорожец А.В., Карпова С.Н.* Актуальные проблемы возрастной психологии. — М., 1978.

*Годфруа Ж.* Что такое психология: В 2 т. — 1992.

*Давыдов В.В.* Проблемы развивающего обучения. — М., 1986.

Диагностика учебной деятельности и интеллектуального развития детей. — М., 1981.

*Зак А.З.* Развитие теоретического мышления у младших школьников. — М., 1984.

*Запорожец А.В.* Избранные психологические труды: В 2 т. — М., 1986.

*Захарова А.В.* Психология обучения старшеклассников. — М., 1976.

*Зик К.* Ребенок и его мир: Советы по умственному развитию детей до 6 лет. — М., 1985.

*Иващенко Ф.И.* Психология трудового воспитания. — Минск, 1988.

*Карпова С.Н., Лысюк Л.Г.* Игра и нравственное развитие школьников. — М., 1986.

*Клаус Г.* Введение в дифференциальную психологию учения. — М., 1987.

*Коломинский Я.Л.* Психология детского коллектива. — Минск, 1984.

*Каламінскі Я.Л.* Чалавек: псіхалогія. — Мінск, 1992.

*Коломинский Я.Л., Панько Е.А.* Учителю о психологии детей шестилетнего возраста. — М., 1988.

*Кон И.С.* Психология ранней юности. — М., 1989.

*Кравцов Г.Г., Кравцова Е.Е.* Шестилетний ребенок: Психологическая готовность к школе. — М., 1987.

*Лейтес Н.С.* Способности и одаренность в детские годы. — М., 1984.

*Леонтьев А.Н.* Избранные психологические произведения: В 2 т. — М., 1983.

*Леонтьев А.Н.* Проблемы развития психики. — М., 1981.

*Линден Ю.* Обезьяны, человек и язык. — М., 1981.

*Лисина М.И.* Проблемы онтогенеза общения. — М., 1986.

*Личко А.Е.* Психопатии и акцентуации характера у подростков. — Л., 1983.

*Маркова А.К.* Психология обучения подростка. — М., 1975.

*Мелхорн Г., Мелхорн Х.-Г.* Гениями не рождаются. — М., 1981.

Мир детства: Дошкольник. — М., 1985.

Мир детства: Младший школьник. — М., 1988.

Мир детства: Подросток. — М., 1989.

Мир детства: Юность. — М., 1988.

*Мишель Кле.* Психология подростка. Психосексуальное развитие. — М., 1991.

*Моргун В.Ф., Толкачева Н.Ю.* Проблемы периодизации развития личности. — М., 1984.

*Мухина В.С.* Детская психология: Учебник для студентов педагогических институтов. — М., 1985.

*Мухина В.С.* Шестилетний ребенок в школе. — М., 1986.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Немов Р.С.* Психология: В 3 кн. Кн. 2. Психология образования. — 2-е изд. — М.: Просвещение: Владос, 1995. — 496 с.

*Обухова Л.Ф.* Концепция Жана Пиаже: за и против. — М., 1981.

Одаренные дети. — М., 1991.

Особенности обучения и психического развития школьников в 15 — 17 лет. — М., 1988.

*Пиаже Жан.* Избранные психологические труды. Психология интеллекта. Генезис числа у ребенка. Логика и психология. — М., 1969.

Развитие личности ребенка. — М., 1987.

Развитие общения дошкольников со сверстниками. — М., 1989.

*Раттер М.* Помощь трудным детям. — М., 1987.

*Рашбург Й., Поппер П.* Секреты личности. — М., 1983.

*Ремшмидт Х.* Подростковый и юношеский возраст: Проблемы взросления. — М.: Мир, 1994.

*Рубинштейн С.Л.* Основы общей психологии: В 2 т. — М., 1989.

*Слобин Д., Грин Дж.* Психолингвистика. — М., 1976.

*Смирнов А.А.* Избранные психологические труды: В 2 т. — М., 1987.

*Субботский Е.В.* Как рождается личность. — М., 1978.

*Фельдштейн Д.И.* Психология развития личности в онтогенезе. — М., 1989.

*Эльконин Д.Б.* Детская психология (развитие ребенка от рождения до семи лет). — М., 1960.

*Эльконин Д.Б.* Психология игры. — М., 1978.

*Эльконин Д.Б.* Психология обучения младшего школьника. — М., 1974.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ